№№35–36
(3372–3373)
11–14 сакавіка 2011 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Выдавец: УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

# Народная Воля

**Да ўвагі!**
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!



А Лукашенка і Пракаповіч так рэкламіравалі залаты запас краіны!

## На 1 сакавіка 2011 года золатавалютныя рэзервы Беларусі склалі 4 мільярды 23,6 мільёна долараў супраць 5 мільярдаў 30,7 мільёна на 1 студзеня. Такім чынам, за два месяцы золатавалютныя рэзервы знізіліся на 1 мільярд 7,1 мільёна долараў, або на 20 працэнтаў.

**АКТУАЛИИ**

*Светлана КАЛИНКИНА*



# Открыл Америку!

Когда-то на меня произвел сильное впечатление рассказ бабушки о том, какой ужас она пережила в детстве. Как кричала по ночам от страха, как смотрела на чистое небо, на облака и рыдала. Как боялась, что скоро ничего этого не увидит. А все потому, что в их деревню забрела некая богомолица с вестью, что в мире происходит страшное. Мол, по городам и весям злые люди затягивают небо железными веревками. Действительно, ужас! Все крестились, плакали, ждали конца света. А потом выяснилось, что и люди не злые, и ничего ужасного они не делали: в деревни стали проводить электричество.

К чему это я вспомнила? Да прочитала интервью Александра Лукашенко газете "Вашингтон пост" с рассуждениями об американской демократии. Открыл Америку! Ну, точь-в-точь та самая богомолица.

Александр Григорьевич признался, что не раз бывал в США и даже в свое время проехал страну "по разным точкам с запада на восток". Вот и я так же. Аккурат во время встречи Лукашенко с американской журналисткой повторила тот же маршрут: с запада на восток, от Вашингтона до Сиэтла, от Атлантического побережья к Тихоокеанскому. Дело в том, что в Соединенных Штатах много лет существует такая программа гостевых визитов — знакомство со страной для политиков, журналистов, общественных деятелей из разных стран. Я была в составе группы белорусских журналистов, Лукашенко, как я понимаю, посещал США, еще будучи депутатом Верховного Совета, поскольку позже у него такой возможности уже не было.

Я абсолютно уверена, что в Вашингтоне возле Белого дома мы с Лукашенко, несмотря на разницу во времени поездок, видели одно и то же зрелище. Меня оно очень впечатлило.

Представьте себе здание, на которое обращено внимание всего мира. Тысячи туристов, журналистов, высокопоставленных гостей каждый день. И прямо возле Белого дома стоит палатка, рядом пошарпанные, написанные от руки плакаты, внутри — покрытый татуировками мрачный человек восседает в кресле и внимательно изучает свой ноутбук. Это знаменитый антиядерный пикет, который круглосуточно проходит возле Белого дома. С протестом выступают то один человек, то много, протестуют то тихо, то громко. Круглые сутки! Вот уже лет тридцать! Без перерыва!

Признаюсь, с моей точки зрения тридцать лет стоять в пикете — это, конечно, ненормально. Но с точки зрения американской демократии никто — ни президент, ни полиция, ни суд — не может лишить человека права на протест. Хочешь — стой! Главное, чтобы не кричал по ночам и не обижал обычных прохожих.

Причем еще одна важная деталь: после терактов расстояние, на котором могут проходить акции протеста возле правительственных зданий, были увеличены, но поскольку данный пикет начался тогда, когда такого правила не существовало, то тронуть его даже после изменения законодательства никто не может.

Подобное вообще мыслимо в Беларуси? Так кому предназначалась сказка о том, что у нас демократии не меньше, чем в США?..

Скажу больше: Лукашенко, похоже, вообще забыл, что такое Белый дом. В интервью "Вашингтон пост" он проводит для американцев параллель: предлагает представить, что было бы, если бы демонстранты шли на Белый дом, как 19 декабря они шли на белорусский Дом правительства. Ничего не было бы, ответила журналистка. И добавила, что, по крайней мере, им бы не грозило 15 лет лишения свободы. Но представительница "Вашингтон пост" не обратила внимания, что сравнение в принципе некорректное и неправильное. Потому что Белый дом — это здание, в котором президент США и работает, и живет с семьей.

Ну не могут США позволить себе отдельные особняки для работы и отдыха главы государства! Вот белорусский президент способен на такую роскошь, у него денег достаточно, а американский — нет. У него все по-простому: знаменитый Овальный кабинет в одном крыле здания, а жилые комнаты — в другом. И здание маленькое, и детям Барака Обамы не нужен электромобиль, чтобы ездить по здешним лужайкам — территория резиденции небольшая совсем. Это у нас глава государства живет с настоящим размахом. Только 19 декабря митингующие не пошли на Дрозды — символ барства дорвавшихся до власти, они не собирались громить камнями окна спальни сына президента. Так что нельзя даже сравнивать произошедшее в Минске с гипотетическим штурмом Белого дома. Наши митингующие пошли к зданию парламента и правительства. И во всем мире такое нормально.

Многотысячные акции протеста в эти дни проходят возле американского Капитолия, их чуть ли не каждый день показывают по ТВ. Но я даже не о том хочу сказать, что демонстрантов никто пальцем не трогает. Вы обратите внимание на здание. Не в пример Белому дому оно огромное, величественное, красивое. Да к тому же стоит на холме, возвышаясь над городом. Более того, существует закон, по которому здания выше Капитолия в Вашингтоне строить запрещено. Видимо, Александру Лукашенко во время его поездок в США не объяснили, что это не случайно, что это символ.

Величественный Капитолий и скромный Белый дом — это символ того, что главный в стране — народ. Что законодательная власть, которая представляет народ, важнее, что народ стоит над всеми. Что президенты по сути своей работы и миссии — только слуги народа, нанятые менеджеры, которых в любой момент можно уволить. А потому их место — в скромном доме в низинке.

Впрочем, Белый дом, конечно, на самом деле не такой маленький, как кажется, потому что для сотрудников Администрации президента США предусмотрены кабинеты под землей. Но для американцев очень важно, чтобы, глядя на Белый дом и Капитолий, каждый понимал истинную иерархию власти. Президент США в неофициальной иерархии — самый влиятельный человек в мире. Но, согласно традиции, без приглашения даже он не имеет права войти в здание парламента.

Странно, что, стремясь продемонстрировать "глубину знаний" в особенностях американской демократии, Лукашенко об этом важнейшем условии стабильности политической системы США не вспомнил.

Мы, конечно, можем учить жизни весь мир. Мы, конечно, можем искать свой особый путь развития через тюрьмы и репрессии. Мы, конечно, можем слушать "богомолиц", которые утверждают, что наш народ до такой демократии не дозрел... Разноцветная и разноголосая Америка, страна эмигрантов со всех уголков планеты, дозрела 200 лет назад, а мы, высококультурные и высокообразованные европейцы, — все никак. На самом деле, мы не уроды, и мы бы с демократией справились, как с нею справились негры и индейцы Америки. Но наша беда в том, что мы не можем справиться со своими правителями, среди которых пока не нашлось человека, который бы в первую очередь думал не об удобствах жизни в президентской резиденции, а о народе, который своей сложной судьбой давно заслужил право жить и дышать свободно.

**ПРЫСУД**

## Хто ж заступіцца за нашых?

Грамадзяне Расійскай Федэрацыі **Арцём БРЭУС** і **Іван ГАПОНАЎ** — першыя ў шэрагу іншых пакараных па крымінальных справах, звязаных з падзеямі 19 снежня, якіх пракурор не прасіў пасадзіць у турму.

Учора Арцёма Брэуса і Івана Гапонава трэці раз прывозілі ў суд Маскоўскага раёна Мінска за той час, што яны знаходзіліся ў следчым ізалятары. Іх затрымалі 19 снежня і арыштавалі на 10 сутак за ўдзел у масавай акцыі пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў прэзідэнцкіх выбараў. Потым абвінавацілі ва ўдзеле ў масавых беспарадках, якія нібыта мелі месца ў той дзень. Адвакаты, праўда, гэта катэгарычна аспрэчваюць. На іх думку, ніякіх беспарадкаў увогуле не было, было звычайнае хуліганства з боку шэрагу асоб.

Спачатку ў справе Брэуса і Гапонава ўсё было вельмі сур'ёзна. Як жа, іншаземцы "грамілі" Дом урада! Але на першым судзе сведка — міліцыянер **Алег ДУДАРЧЫК** — зусім заблытаўся. Нават не здолеў толкам патлумачыць, у якім месцы і ў які час адбываліся падзеі. Але пры гэтым казаў, што бачыў, як Гапонаў біў спецназаўцаў па шчытах.

Другі сведка — міліцыянер **ЯКАЎЛЕЎ** — увогуле не змог паказаць, хто на працэсе Брэус, а хто Гапонаў, і пераблытаў абвінавачаных.

На пасяджэнне суда 10 сакавіка прыйшлі 15 трэніраваных спецназаўцаў на чале з намеснікам іх камандзіра **Аляксандрам КАШТАЛАНАМ**. Ён заявіў, што чуў, як праз гукаўзмацняльнік выступоўцы неаднаразова заклікалі штурмаваць будынак Дома ўрада. Трое яго падначаленых паўтарылі яго словы, але іншыя ўстрымаліся. Як тады ставіцца да паказанняў усіх сведак-міліцыянераў ва ўсіх ранейшых судах па справах 19 снежня, якія сцвярджалі, што выступоўцы не заклікалі штурмаваць Дом урада ці прарываць ачапленне спецназу?..

Акрамя таго, на судзе над расійскімі грамадзянамі высветлілася, што з вялікай масы міліцыянераў толькі прыкладна паўтара дзясятка чалавек звярнуліся па медыцынскую дапамогу. І то на наступны дзень — хто з сіняком на назе, хто на руцэ... А ўспомніце, што нам расказвала БТ!

Назіральнікі задаваліся пытаннем: для чаго спатрэбілася дапытваць такую колькасць спецназаўцаў? Некаторыя лічаць, што гэта было зроблена дзеля таго, каб падмацаваць ранейшае абвінавачанне. Але... Працэс пайшоў у іншым накірунку. Адной з галоўных прычын з'яўляецца, мабыць, тое, што справа Арцёма Брэуса і Івана Гапонава разглядалася напярэдадні пасяджэння Савета міністраў саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі з удзелам Уладзіміра Пуціна. Расійскі бок неаднаразова заклікаў беларускія ўлады вызваліць грамадзян Расіі. Падобна на тое, што беларускія пракуроры вельмі старaліся даказаць Пуціну, што абвінавачанні сур'ёзныя, але, каб замацаваць сяброўства паміж краінамі, мы ідзём на саступкі.

Калі гэты нумар здаваўся ў друк, прыгавор яшчэ не быў вынесены, але нам, журналістам, ужо пад вечар няцяжка было спрагназаваць канчатковы прысуд. Мы рады за Арцёма і Івана. Толькі застаецца пытанне: чаму для беларусаў пракуроры патрабавалі суровыя тэрміны зняволення? Расія за сваіх заступілася, а хто заступіцца за нашых?

**Любоў ЛУНЁВА.**

## Мядзведзь не прызнаў сябе вінаватым

Справа Дзмітрыя Мядзведзя разглядалася ўчора ў Маскоўскім судзе г.Мінска. Адвакаты настойвалі на тым, што іх падабаронны не вінаваты.

Пракурор Мазоўка заявіў: нягледзячы на тое што Дзмітрый Мядзведзеў не прызнаў сваёй віны, яна даказана следствам і судом "у поўным аб'ёме". І папрасіў даць Дзмітрыю Мядзведзю чатыры гады калоніі строгага рэжыму.

Аб канчатковым прысудзе стала вядома, калі гэты нумар "Народнай Волі" ўжо тыражаваўся ў друкарні.

## Мужная Наста

20-гадовая Наста Палажанка стала першай беларускай, узнагароджанай прэстыжнай Міжнароднай жаночай прэміяй за мужнасць, якую Дзярждэпартамент ЗША прысуджае штогод дзесяці жанчынам розных узростаў і нацыянальнасцяў.

Цырымонія ўзнагароджання прайшла 8 сакавіка ў Вашынгтоне. Хілары Клінтан, якая ўручала ўзнагароды, выказала шкадаванне ў сувязі з тым, што Наста Палажанка і Ёані Санчэз з Кубы не здолелі прыехаць на цырымонію, бо ўлады іх краін ім гэтага не дазволілі. Дзяржсакратар ЗША сказала: *"Наста Палажанка з Беларусі жыве ў складаны час. Краіна ў цэнтры Еўропы дагэтуль прыгнятае свой народ, фальсіфікуе выбары, самым жорсткім і брутальным чынам зняволівае палітычных апанентаў, каб іх папалохаць. Але яна не спужалася і выказала сваю пазіцыю".*

Ад імя Хілары Клінтан віншаванні Насце перадаў Часовы паверэны ў справах ЗША ў Беларусі Майкл Скэнлан. У гонар Насты і іншых смелых беларускіх жанчын у рэзідэнцыі прадстаўніка ЗША ў чацвер быў наладжаны спецыяльны прыём.

**Ігар МАРОЗАЎ.**

**ИЗ ПЕРВЫХ УСТ**

*Константин СЕВЕРИНЕЦ:*

# «Я ценю выбор сына...»

*Брутальный разгон мирной демонстрации 19 декабря, арест более 700 человек, возбуждение уголовных дел практически против всех кандидатов в президенты и их доверенных лиц - вещь, конечно, неслыханная и невиданная.*

*Для кого-то эхо тех дней, может быть, и становится слабее, но не для тех, кто протестовал против фальсификации итогов выборов, кто открыто и мирно вышел выразить свой протест на Площадь.*

*Сегодняшний собеседник газеты — Константин Северинец, отец известного политика, ныне заключенного печально известной "американки" Павла Северинца.*

**— Нетрудно представить ваше состояние души, когда сына вот уже более двух месяцев держат в тюрьме. В памяти, наверное, перебираете каждый шаг Паши...**

— А что еще остается делать? Таким сыном можно гордиться. Еще в школе он был на виду. Круглый отличник. Золотой медалист. Участник многочисленных олимпиад практически по всем предметам. Во время демократических перемен Паша учился в 10-м классе. Он был избран представителем от Витебщины в созданный тогда Детский республиканский парламент. Вдохнул, так сказать, и плюрализма мнений, прикоснулся к белорусскости, поскольку был единственным из участников, кто выступал на белорусском языке. При Министерстве образования Беларуси была такая задумка — привлечь молодежь к политической деятельности. С тех пор мой сын — в политике.

**— В какой школе учился Павел?**

— В одной из лучших витебских школ, 25-й, с художественным уклоном. Еще школьником увлекался географией и геологией. До сих пор у него в комнате хранится большая коллекция камней и минералов, собранных в разных уголках Витебщины. Естественно, поступил на геофак БГУ и успешно его окончил. Конечно, не всем нравилась политическая деятельность Павла в студенчестве. Нашлись преподаватели, которые хотели создать ему сложности, но очень по-доброму отнесся к студенту Северинцу тогдашний ректор БГУ Александр Козулин, не дал его в обиду.

**— Оторвавшись от родительской опеки, молодой человек мог бы и поддаться столичным соблазнам...**

— Не привлекали его дружеские пирушки, посиделки под сигаретку с кофе, пустые дискотеки. Однажды он попал на какое-то мероприятие БНФ. Увлекся идеями белорусизации, укрепления национального самосознания.

(Окончание на 2-й стр. )

## Не спазніцеся!

***Шаноўныя чытачы! Многія з Вас аформілі падпіску на "Народную Волю" толькі на першы квартал. Не забудзьце працягнуць яе на красавік—чэрвень. Засталося мала часу, не спазніцеся.***

*Вы — з «Народнай Воляй», «Народная Воля» — з Вамі!*

# Адкрыты ліст

## генеральнаму пракурору Рэспублікі Беларусь Рыгору Васілевічу

Трэці месяц мой сын Аляксандр знаходзіцца ў следчым ізалятары КДБ — сумнавядомай "амерыканцы". Ён зняволены за падзеі Плошчы 19 снежня. У мяне ёсць сур'ёзныя падставы меркаваць, што над ім чыняць здзек, псіхалагічна ламаюць, ігнаруючы элементарныя нормы закону.

Пасля шквалу грамадскага абурэння вашы падначаленыя праверылі ўмовы ўтрымання вязняў у "амерыканцы" ды бадзёра даклалі, што там ледзь ці не курорт. Вось толькі экс-кандыдат у прэзідэнты Алесь Міхалевіч, вырваўшыся з-за кратаў, удакладніў, што там за курорт. Ягоныя сведчанні аб катаваннях сталі інфармацыйнай бомбай.

Дар'я Корсак, жонка асуджанага на чатыры гады па справе аб масавых беспарадках Аляксандра Атрошчанкава, з ягоных слоў публічна засведчыла, што супраць яе мужа, які быў прэс-сакратаром Андрэя Саннікава, у следчым ізалятары таксама ўжываліся катаванні.

Ёсць падставы падазраваць, што супраць майго сына могуць ужывацца яшчэ болей жорсткія метады. Уяўляю, як магло раз'юшыць каго-кольвек з сілавікоў тое, што 19 снежня ў падзеях на плошчы Незалежнасці ўдзельнічаў на баку маніфестантаў былы міліцыянт, лейтэнант запасу Класкоўскі. Так бы мовіць, зганьбіў гонар мундзіра, як яго разумеюць некаторыя! Трэба ж пакараць узорна, растаптаць, каб нікому з людзей у пагонах і ў галаву не прыйшло бунтаваць супраць рэжыму!

Калі арыштоўвалі, то цэлую аперацыю зладзілі супраць бяззбройнага чалавека, шматкватэрны дом на вушы паставілі, брыдка лаяліся, двое дзвярэй у кватэру зламалі — карацей, супермэны, сапраўдныя героі! Добра, што яшчэ дзетак дома не было (у Сашы іх трое: Алёшку — 12, Дашы — 7, Арсеню — два гады).

Калі ўварваліся, то Сашу, паваліўшы на падлогу ды накінуўшы кайданкі, жорстка збілі, магчыма, паламалі рэбры. Пры гэтым абяцалі "зладзіць салодкае жыццё" за кратамі. Потым сын у лістах сваёй жонцы скардзіўся на моцныя болі ў баку. Ёсць вялікія сумневы наконт таго, ці аказвалася яму належная медыцынская дапамога.

На звароты наконт змянення меры стрымання — адмова. Жонка Аляксандра Наталля дарэмна дамагаецца спаткання з ім. За два з паловай месяцы ад Сашы дайшло на волю толькі чатыры лісты, хоць, мяркуючы па тэкстах, напісаў ён значна болей.

Таксама з іх зместу вынікае, што сын не атрымаў ніводнага ліста ад мяне. Невядома, ці трапляюць да яго мае грашовыя пераводы. Мая дачка Вольга піша Сашу амаль штодня, але за ўвесь час дайшла толькі пара лістоў. Ведаю таксама, што на яго імя ідзе шмат карэспандэнцыі са словамі падтрымкі ад іншых людзей. Але сын у апошнім лісце сваёй жонцы паведамляе пра інфармацыйны вакуум, зазначае: такое ўражанне, што пра мяне ўсе забыліся...

Куды ж падзелася львіная доля адрасаваных яму лістоў ды паштовак? Які "паштар" у ведамстве жалезнага Фелікса так заўзята іх "фільтруе"?

Інфармацыйная блакада — гэта таксама катаванне. Майго сына псіхалагічна душаць, ламаюць, а Генпракуратура даводзіць, што вязні там, лічы, як у санаторыі!

Галоўнае ж — Аляксандр пазбаўлены належнай юрыдычнай дапамогі. Можа, толькі яму так не шанцуе? Ды не ж, аналагічна адрэзалі ад паўнавартасных кантактаў з адвакатамі ўсіх зняволеных за Плошчу. Наколькі мне вядома, ніводнаму з іх дасюль не далі магчымасці сустрэцца з адвакатам адзін на адзін.

Адвакаты па "справе 19 снежня" цэлыя дні праседжваюць са сваімі заяўкамі-ордэрамі ў прыёмнай КДБ, марна спадзеючыся сустрэцца з падабароннымі. Так, за ўвесь час знаходжання Сашы ў следчым ізалятары адвакат Ірына Бурак бачыла яго толькі двойчы і толькі падчас допытаў. Апошні раз — 13 студзеня. Натуральна, у такіх умовах немагчыма аказаць нармальную юрыдычную дапамогу. Ірыне Бурак ніводнага разу не далі магчымасці сустрэцца з Аляксандрам сам-насам, як тое прадугледжана законам.

Адвакаты, звязаныя са "справай 19 снежня", нязменна чуюць: для сустрэч з падабароннымі няма вольных пакояў! Між тым для адвакатаў па іншых, не "палітычных", справах пакоі дзіўным чынам знаходзяцца.

Магутнаму ведамству, што займае квартал у цэнтры сталіцы, уключна з палацам, пабудаваным яшчэ на замову паплечніка Берыі — Лаўрэнція Цанавы, смешна спасылацца на недахоп плошчаў. Гэта выглядае як здзек. Выснова напрошваецца адна: вязняў па "справе 19 снежня" наўмысна, цынічным чынам адсякаюць ад юрыдычнай дапамогі.

Ці мо баяцца, што выйдзе на волю непажаданая інфармацыя пра тое, якім чынам там дамагаюцца "патрэбных" паказанняў? Дык што, не толькі палац Цанавы застаўся, але і ягоны дух, ягоныя метады?

У 1930 годзе мой прадзед, селянін Вацлаў Класкоўскі, быў асуджаны сумна вядомай "тройкай" па артыкулах "бандытызм" ды "антысавецкая агітацыя". Сталінскія апрычнікі расправіліся з чалавекам толькі за тое, што на вясковым сходзе скрытыкаваў калгасны лад. Майго прадзеда рэабілітавалі пасля смерці Сталіна, у 1960 годзе.

Выглядае на тое, што зараз падобная машына рэпрэсій хоча скалечыць, зламаць, згнаіць майго сына ды іншых арыштаваных за Плошчу.

Пракуратура мусіць рэагаваць на выступы ў друку, калі гаворка ідзе аб парушэнні законнасці. Тут жа, на мой погляд, законнасць проста топчуць. Адрэагуйце, спадар генпракурор!

Калі майму сыну, а таксама іншым вязням "амерыканкі", зняволеным за падзеі 19 снежня, будуць забяспечаны нармальнае ліставанне, магчымасць спаткацца з блізкімі сваякамі, сустрэчы сам-насам з адвакатам — тады, бадай, можна будзе даць веры, што пракуратура ў нашай краіне не проста шыльда.

**Аляксандр КЛАСКОЎСКІ,
журналіст,
палітычны аналітык,
бацька зняволенага
Аляксандра
Класкоўскага.**

Народная Воля http://www.nv-online.info
11—14 САКАВІКА 2011 г.

ЛЁС ЧАЛАВЕКА

# Глухі суд

## Суддзя Пухавіцкага раённага суда Святлана Акуліч не аднавіла на працы адну з лепшых настаўніц Талькаўскай сярэдняй школы Наталлю Ільініч.



Суддзя Святлана Акуліч прыняла парадаксальнае рашэнне.

Разгляд іскавай заявы Наталлі Ільініч адбываўся ў адной з самых вялікіх залаў Пухавіцкага суда. Напэўна, таму, што жадаючых папрысутнічаць на працэсе было зашмат — падтрымаць Ільініч прыйшлі яе былыя выпускнікі, былыя калегі, бацькі вучняў. Алена Шамак і Марына Камароўская прыехалі нават з Мінска. Ведаючы ўсе акалічнасці гэтай справы, я шчыра і прыемна здзівілася, калі даведалася, што сведкамі вырашылі выступіць і калегі Наталлі Ільініч — завуч Талькаўскай школы Людміла Місуна і настаўніца нямецкай мовы Валянціна Аўдошчанка. Калі ў студзені стала вядома, што з Ільініч новы дырэктар не збіраецца працягваць працоўны кантракт, калегі Наталлі асабліва не выказвалі сваю пазіцыю, моўчкі, як бы збоку сачылі за тым, што адбываецца. А зараз у судзе сведчанні педагогаў Талькаўскай школы сталі самай яскравай характарыстыкай узніклай сітуацыі са звальненнем Наталлі Ільініч. Але, як аказалася, чамусьці не сталі аргументам для суда...

Пра тое, што справа гэта незвычайная, не шараговы выпадак звальнення настаўніцы, сведчыў і той факт, што ў грамадзянскім працэсе ўдзельнічаў дарадца пракурора раёна Дзмітрый Цыкал. Па яго хадайніцтве трэцяй асобай па справе выступаў раённы аддзел адукацыі, які прадстаўляла метадыст Таццяна Валасюк (у яе, праўда, не ўзнікла пытанняў падчас разбіральніцтва ні да ніводнага з бакоў, ні да сведкаў). А ў прысутных з'явілася надзея, што суддзя калі і не задаволіць іск у тым выглядзе, у якім ён пададзены, дык, можа, абавяжа аддзел адукацыі працаўладкаваць такога прафесійнага настаўніка, як Наталля Ільініч. Справа ў тым, што на пачатку слуханняў дырэктару школы Наталлі Меркуль прадстаўнік Ільініч адвакат Марына Кавалеўская прапанавала мірнае пагадненне, але Меркуль ад яго адмовілася, спаслаўшыся на тое, што на месца Ільініч узяла другога настаўніка, а вакантных месц у школе няма. Таму і падалося, што, можа, недарэчную памылку са звальненнем у рэшце рэшт выправіць раённы аддзел адукацыі. Ну немагчыма, каб наша адукацыя адмаўлялася ад настаўнікаў такога ўзроўню, якіх так бракуе! Аказалася, што магчыма. Відаць, сёння прафесіяналізм настаўніка — не галоўная якасць, не вызначальны крытэрый для працы ў школе.

Што да судовага разгляду, то Наталля Ільініч адразу пацвердзіла свае іскавыя патрабаванні: аднавіць яе на працы, спагнаць з наймальніка сярэдні заробак за час вымушанага прагулу, а таксама маральную кампенсацыю ў памеры 20 мільёнаў рублёў. А потым, відаць, акрыленая тым, што столькі людзей прыйшлі ў суд пацвердзіць, што праўда на яе баку, пашкадавала адказчыка і зменшыла суму маральнай кампенсацыі да аднаго мільёна...

Наталля рабіла акцэнт на тым, што дырэктар школы, прымаючы рашэнне не працягваць з ёю кантракт, парушыла адзін з пунктаў калектыўнага дагавору, у якім сказана, што з работнікамі, якія паспяхова і добрасумленна выконваюць службовыя абавязкі, не дапускаюць парушэнняў працоўнай дысцыпліны і маюць працяглы стаж работы, кантракт заключаецца тэрмінам ад 3 да 5 год. Дарэчы, камісія па працоўных спрэчках Талькаўскай школы, у склад якой уваходзяць два супрацоўнікі адміністрацыі школы і два настаўнікі ад калектыву, аднагалосна прызналі, што звальненне Наталлі супярэчыць менавіта гэтаму пункту калектыўнай дамовы, а таму — незаконнае. Ільініч працуе ў Талькаўскай школе амаль 26 гадоў. Яна адна з чатырох настаўнікаў (усяго ў школе іх 19), якія маюць вышэйшую катэгорыю. Здавалася б, каму, як не Наталлі, вучыць дзяцей гісторыі!

Наталля Ільініч настойвала на тым, што яе звальненне з працы і адмова ў заключэнні новага працоўнага кантракта — гэта палітычна матываванае рашэнне дырэктара, што прэтэнзіі з боку Меркуль узніклі пасля таго, як у Ільініч дома адбыўся вобыск пасля падзей 19 снежня. *"Дырэктар не збіралася мяне звальняць. Яна планавала задзейнічаць мяне ў шэрагу агульнашкольных мерапрыемстваў у лютым і ў сакавіку. І раптам усё змянілася. 11 студзеня Наталля Віктараўна сказала мне, што ёй патрэбны настаўнікі законапаслухмяныя, што яна не можа са мною працаваць, і аб'явіла, што не падоўжыць мой працоўны кантракт".*

Грамадзянская пазіцыя Наталлі Ільініч вядомая. Яна яе ніколі не хавала. Калі ўвосень 2009 года ўся вёска Талька пратэставала супраць аб'яднання Талькаўскага і Блужскага сельскіх Саветаў, Наталля Ільініч паставіла свой подпіс пад зваротам у абласны і раённы Саветы. На пачатку 2010 года Наталля Ільініч адстаяла сваё права заставацца сябрам Партыі БНФ, калі ёй начальнік Мінскага абласнога ўпраўлення адукацыі Таіса Данілевіч ультыматыўна прапанавала: альбо праца ў школе, альбо сяброўства ў апазіцыйнай партыі. На мінулых прэзідэнцкіх выбарах збірала подпісы за кандыдата ад Партыі БНФ. Але ніколі і нікому ў школе Ільініч не навязвала сваіх поглядаў. Вучыла дзяцей гісторыі, вучыла любіць сваю радзіму, стаптала з вучнямі ўсе навакольныя сцежкі, шукаючы сведкаў пра сваіх слаўтых землякоў. Пра гэта на судзе расказвалі ўсе — і калегі, і былыя вучні Ільініч. *"Наталля Валянцінаўна тлумачыла матэрыял так, што не зразумець яго было немагчыма,* — сведчыла ў судзе выпускніца Талькаўскай школы Марына Камароўская. — *Яна спісвала ўсю дошку разам з намі, яе канспекты я да гэтага часу захоўваю. Як настаўнік яна давала ўсё, што магла, а далейшае залежала ад нашага жадання вучыцца".*

Дырэктар Наталля Меркуль імкнулася пераканаць суд, што ніякай палітыкі ў яе рашэнні няма, што ў працы Ільініч мелі месца парушэнні працоўнай дысцыпліны і таму яна вырашыла не працягваць з ёю працоўны кантракт. Але якія гэта парушэнні? Наталля рабіла памылкі ў школьным журнале, нясвоечасова выставіла адзнакі за чвэрць у дзённік дзецям. У мінулым годзе ў Ільініч нават была вымова за тое, што адзнакі ў дзённікі яна выставіла са спазненнем. Але калі Меркуль прымала рашэнне не працягваць з настаўніцай кантракт, гэтая вымова ўжо была "пагашана".

— Такія памылкі дапускаюць усе настаўнікі школы, — у адказ на абвінавачанні казала ў судзе Ільініч. І нават прынесла копіі са школьных журналаў. Памылкі ёсць, аказваецца, і ў дырэктара Меркуль. Больш за тое, такая прынцыповая пазіцыя Меркуль — не мае права настаўнік вышэйшай катэгорыі рабіць памылкі ў дакументацыі — зусім паблякла, калі Наталля Ільініч заявіла хадайніцтва далучыць да справы копію яе працоўнай кніжкі. Высветлілася, што апошні запіс у ёй быў зроблены ў 2005 годзе, калі з Ільініч працягвалі кантракт да 2010 года. А ў 2010 годзе новы запіс адміністрацыя школы зрабіць папросту забылася. Што ж, дырэктара таксама трэба звальняць?!

Увогуле абгрунтаванні пазіцыі дырэктара Меркуль выглядалі непераканаўча. Яна імкнулася даказаць, што пасля 2005 года ў працы Ільініч не было поспехаў, што яе вучні нідзе сябе не праявілі, а вось у мінулым годзе "дзяўчынка са школы выйшла на абласны ўзровень па Правілах дарожнага руху". У адказ Наталля Ільініч прад'явіла суду дыпломы раённага аддзела адукацыі, падзячнае пісьмо Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцяў пры Савеце міністраў, даты на якіх — 2007-ы, 2009-ы і 2010 гады. Нагадала дырэктару, што ў 2007 годзе яе вучаніца Марына Камароўская заняла трэцяе месца на раённай алімпіядзе па грамадазнаўстве, у 2006-м Дар'я Ільініч — другое месца па гісторыі. Па якіх яшчэ прадметах ёсць такія поспехі ў школе?!

У Меркуль застаўся апошні аргумент — яна заявіла, што пасля таго, як даведалася, што ў доме Ільініч адбыўся вобыск, вырашыла вывучыць яе асабістую справу (а за 4 месяцы працы часу не хапіла?) і высветліла, што ў 2007 годзе Ільініч была прыцягнута да крымінальнай адказнасці за схіленне да парушэння заканадаўства. Наталля патлумачыла: папрасіла ў мясцовага лекара даведку для дачкі, якая хацела паехаць у Польшчу. Узгадніць ад'езд з міністрам адукацыі, як таго патрабуюць правілы БДУ, дачка не паспела, таму прыйшлося звярнуцца да такога "ўчынку". Гэтая судзімасць даўно ўжо пагашаная, тым не менш Меркуль яе ўзгадала, а дарадца пракурора выступіў з хадайніцтвам дадаць копію да справы. Адвакат Ільініч была супраць хадайніцтва, тым не менш суддзя да справы яе дадала.

Самы напружаны момант быў падчас сведчанняў калег Наталлі Ільініч — завуча Людмілы Місуна і настаўніцы нямецкай мовы Валянціны Аўдошчанка. Яны не пабаяліся прыйсці ў суд і засведчыць, што Ільініч — адна з лепшых настаўніц школы, што такія промахі, якія дапускала Наталля, здараюцца ў рабоце амаль усіх педагогаў Талькаўскай школы, бо іх немагчыма не рабіць — правілы штогод мяняюцца. Што ж, цяпер усіх звальняць?! Па-другое, у судзе высветлілася, што рашэнне не працягваць кантракт дырэктар Наталля Меркуль прымала асабіста. Не параілася нават з завучам школы, якая працуе ў Талькаўскай СШ больш за 10 гадоў, не прыслухалася да просьб прафкама не звальняць Ільініч. Наталля Меркуль працуе ў школе толькі з верасня 2010 года (!) і ўзяла на сябе такое адказнае рашэнне — звольніла настаўніцу, па сутнасці выкінула яе на вуліцу, бо ўсім зразумела, што вясковаму настаўніку ўладкавацца на працу вельмі складана. Ці гэта ўсё ж такі было не рашэнне Меркуль?! Проста яе выкарысталі...

Валянціна Аўдошчанка нават прыгадала, што зімой 2010 года, пасля таго як Наталля Ільініч адмовілася прымаць "прапанову" начальніка Мінскага абласнога ўпраўлення адукацыі Таісы Данілевіч выйсці з Партыі БНФ, у школе адбыўся сход, на якім настаўнікам параілі выказаць ганьбу Ільініч, але настаўнікі адмовіліся.

— Мы збіралі подпісы ў школе, каб дырэктар працягнула з Наталляй Валянцінаўнай кантракт, — сведчыла ў судзе Валянціна Аўдошчанка. — Прасілі даць дарабіць хаця б да пенсіі па выслузе гадоў. Гэта была мінімальная просьба, каб паступіць па-чалавечы ў адносінах да настаўніцы, якая столькі год жыццяў аддала школе.

— Пра інтарэсы дзяцей чаму не думаем? Хіба ім не складана пасярэдзіне года аказацца з іншым настаўнікам? — гучалі ў судовай зале пытанні Валянціны Аўдошчанка.

Пасля першага дня судовага пасяджэння былыя вучні Наталлі Ільініч падсумавалі: *"Наталля Валянцінаўна перамажа. Усё ж відавочна. На яе баку ўсе настаўнікі, бацькі, на яе баку праўда. У дырэктара ніводнага сур'ёзнага аргумента! Што б ні казала Меркуль, але звольніла яна Ільініч беспадстаўна... Суддзя да таго ж пацікавілася, ці адна Ільініч выхоўвае дачку-студэнтку..."*

...Учора Святлана Акуліч вынесла рашэнне: у іскавай заяве Наталлі Ільініч часткова адмовіць (у патрабаванні аднавіць яе на працы), абавязаць Пухавіцкі раённы аддзел адукацыі выплаціць ёй кампенсацыю маральнай шкоды ў памеры 200 тысяч рублёў і кампенсаваць паслугі адваката ў памеры 175 тысяч рублёў. Сапраўдны судовы парадокс: суд прызнаў, што настаўніцы нанесена маральная шкода, але пры гэтым кіраўнік установы адукацыі закон не парушыў. За што тады павінен адказваць рублём аддзел адукацыі?..

Здавалася б, якія яшчэ трэба мець доказы, каб пераканаць суд, міністра адукацыі (а да яго таксама звярталася Наталля Ільініч), што няма падстаў адмаўляць ёй у праве на працу, у праве вучыць дзяцей, бо сваю справу яна выконвае добрасумленна і прафесійна?!

А можа, усё ж такі трэба прызнаць, што ў Беларусі адбываецца дыскрымінацыйны падыход да настаўнікаў, якія вылучаюцца з агульнай масы сваімі поглядамі?..

**Марыя ЭЙСМАНТ.**

**P.S.** *Можна чакаць, што Наталля Ільініч абскардзіць вердыкт суддзі Святланы Акуліч. "Народная Воля" праінфармуе сваіх чытачоў аб тым, як канчаткова вырашыцца лёс адной з лепшых настаўніц Талькаўскай сярэдняй школы Пухавіцкага раёна.*



Наталлю Меркуль (на здымку злева) не задавальняла праца такой настаўніцы, як Наталля Ільініч (на здымку справа).

## Лукашэнка сцеліць дарогу для Грэфа

*Амаль адзін мільярд долараў інвестыцый уклаў у беларускую эканоміку "Сбербанк России".*

Такую лічбу назваў на сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам прэзідэнт — старшыня праўлення гэтага найбуйнейшага расійскага банка Герман Грэф.

Сустрэча была незвычайнай тым, што на гэты раз Лукашэнка не высоўваў патэнцыйным інвестарам аніякіх умоў. Ён заявіў, што гатоў "падтрымаць любыя праекты "Сбербанка".

*"Банк выказаў жаданне фінансаваць розныя праекты. Выбірайце любыя, мы вам абсалютна давяраем",* — сказаў Лукашэнка.

Былы старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Станіслаў Багданкевіч тлумачыць такую незвычайную танальнасць размовы наступным чынам: *"Беларусі тэрмінова неабходна атрымаць 5—7 мільярдаў долараў. Ніякай упэўненасці, што іх дасць Захад, у Лукашэнкі няма. Вось ён і "прагінаецца" перад грашыма "Сбербанка".*

## В Минск из Триполи вылетел самолет с белорусами

На борту самолета "Белавиа" также находились граждане ряда других стран, которые изъявили желание покинуть страну, охваченную беспорядками. Об этом БелаПАН сообщила заместитель начальника управления информации — начальник отдела пресс-службы МИД Беларуси Мария Ваньшина.

По ее словам, в самолете находятся 50 человек, среди которых 12 граждан Беларуси, 17 — Украины, 16 — России, по два из Грузии и Болгарии, один из Ливии.

На момент сдачи этого номера в печать самолет из Триполи в минском аэропорту еще не приземлился.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

## По просьбе Светланы Байковой в СИЗО истязали граждан?

*Вчера, 10 марта, в Верховном суде Беларуси стартовал судебный процесс по делу старшего следователя по особо важным делам Генеральной прокуратуры Светланы Байковой.*

Как уже сообщала "Народная Воля", она обвиняется по пяти статьям Уголовного кодекса: "Привлечение в качестве обвиняемого заведомо невиновного", "Принуждение к даче показаний", "Заведомо незаконное задержание или заключение под стражей", "Злоупотребление властью или служебными полномочиями", "Превышение власти или служебных полномочий".

В суд ее привезли под охраной.

По делу проходит шесть потерпевших, один из которых — обвиняемый по делу бывшего главы Департамента финансовых расследований **Анатолия Громовича.** Кстати, расследовала дело Громовича именно Светлана Байкова. Громовичу, напомним, предъявлено обвинение по ч.3 ст. 258 *"Создание преступной организации либо участие в ней"* Уголовного кодекса Беларуси. По данному делу проходит более 30 обвиняемых, среди которых — бывшие сотрудники таможенных и правоохранительных органов. Дело касается эпизодов незаконного перемещения через пограничный пункт пропуска "Западный Буг" крупных партий одежды и бытовой техники. По предварительным оценкам ущерб, нанесенный государству от неуплаты налогов с ввезенных товаров, составляет не менее 20 миллиардов белорусских рублей.

Приговор по делу экс-начальника ДФР еще не вынесен, некоторое время он находился под арестом, а сейчас, если верить нашим источникам, под подпиской о невыезде.

На скамье подсудимых вместе со Светланой Байковой — **Карен Вартанян**. Ему инкриминируется ч.1 ст.154 Уголовного кодекса — *"Умышленное причинение продолжительной боли или мучений способами, вызывающими особые физические и психические страдания потерпевшего, либо систематическое нанесение побоев, не повлекшее последствий".*

На форумах в интернете Карена Вартаняна называли "камерным агентом": мол, находясь в СИЗО, он в прямом смысле слова выбивал из своих сокамерников информацию, необходимую той же Байковой.

Светлана Байкова вроде бы отрицает свою причастность к истязаниям граждан.

Суд по делу Светланы Байковой, напомним, проходит в закрытом режиме. Никого из тех, кто не имеет отношения к процессу, в зал заседаний не пускают.

**Марина КОКТЫШ.**

## Час, наперад!

*На тэрыторыі Беларусі 27 сакавіка ў дзве гадзіны ночы стрэлкі гадзіннікаў будуць пераведзены на адну гадзіну наперад.*

Такім чынам у Беларусі будзе ажыццёўлены пераход на летні час.

Рашэнне аб тым, ці будзе Беларусь у далейшым пераходзіць на зімовы час, пакуль не прынята. Нагадаем, што расіяне ўжо аб'явілі, што адмовяцца ад зімовай гульні з гадзіннікамі.

СТРАТЫ

## Памёр пісьменнік Янка Сіпакоў

*10 сакавіка на 75-м годзе пайшоў з жыцця пісьменнік Янка Сіпакоў.*

Янка Сіпакоў нарадзіўся ў вёсцы Зубрэвічы Аршанскага раёна. Скончыў аддзяленне журналістыкі філфака БДУ.

Першы верш надрукаваў у 1953 годзе ў аршанскай раённай газеце "Ленінскі прызыў". Аўтар паэтычных зборнікаў "Сонечны дождж", "З вясны ў лета", "У поўдзень, да вады", кніг прозы "Крыло цішыні", "Жанчына сярод мужчын", "Журба ў стылі рэтра". Перакладаў на беларускую паэзію У.Уітмена, Хо Шы Міна, Ф.Прэшарна, Р.Гамзатава, Д.Паўлычкі.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР за кнігу паэзіі "Веча славянскіх балад".

*"Для мяне гэта жахлівая вестка,* — гаворыць паэт **Генадзь Бураўкін**. — *Зусім нядаўна мы разам ляжалі ў бальніцы. Ён трывожыўся за жыццё. Я стараўся вывесці яго з сумнага стану, надаць весялосці. Можа, і дарма — трэба было пагаварыць па-іншаму. Але мне не хацелася верыць, што яго хвароба скончыцца так трагічна. Янка Сіпакоў з нашага пакалення шасцідзесятнікаў, пакалення, апаленага вайной. Для мяне ён быў найбольш беларускім па характары і ў творчасці".*

# «Я ценю выбор сына...»

*(Окончание. Начало на 1-й стр. )*

С тех пор только на белорусском языке и разговаривает, хотя воспитывался в русскоязычной семье. Мы с Татьяной, его мамой, выпускники русского отделения филфака БГУ.

Сейчас Павел — известный политик и литератор, лауреат литературной премии имени Алеся Адамовича и премии имени Василя Быкова "За свободу мысли". Является одним из четырех сопредседателей создаваемой партии "Белорусская христианская демократия" (БХД).

— **И чем же интересна эта идея христианской демократии? Что это вообще такое? Многие путают это движение с религиозными организациями…**

— Насколько я знаю, вся деятельность создаваемой БХД строится на христианских принципах, известных каждому: не убий, не укради, не прелюбодействуй и т.д. Но, к сожалению, многим белорусам нужны лишь чарка да шкварка, а остальное — "мая хата з краю". Не хотят понимать, что, как говорил кто-то из мудрых, если ты не занимаешься политикой, то, в конце концов, политика займется тобой.

— **Наверняка родительские увлечения передались и сыну?**

— Не исключено.

— **А как родители относятся к партийной, скажем так, деятельности сына?**

— Я ценю его выбор и в лучших устремлениях поддерживаю безусловно и безоговорочно. Мать Павла, Татьяна Евгеньевна, возглавляет витебский оргкомитет по созданию БХД. Мы — единомышленники.

— **Сына, как я понимаю, вы назвали в честь деда. Расскажите, пожалуйста, о своем отце.**

— Он рос в обычной деревне на Гомельщине. Забрали его в действующую армию в 1944 году. Под Могилевом, на речке Проня, была жесточайшая битва с фашистами. Там же отец и потерял ногу. Но до этого успел получить орден Красной Звезды за боевую разведывательную операцию. Воевал он недолго, но вот смог же отличиться даже за такой короткий срок. После войны работал, потом заболел, но, слава Богу, 85 лет прожил. По белорусским меркам — немало. Прожил достойно, пользовался авторитетом в деревне.

— **Как дедушка относился к политической деятельности внука?**

— С пониманием. Хотя был против того, чтобы внук занимался политикой. Наверное, по крестьянской предусмотрительности, с желанием уберечь его от неприятностей. Воспитанный при советской власти, дед считал, что начальников нужно слушаться и не спорить с ними, а то до беды недалеко. Но каждому приезду Павла радовался и ждал этого момента.

**—А бабушка?**

— Как все женщины, волнуется, переживает за внука. Для нее главное, чтобы был обут-одет, накормлен и здоров.

— **Что сейчас известно про Павла?**

— Он практически изолирован и от нас, и от адвоката, и от соратников, и от общества. Уже более двух месяцев на самых высоких уровнях мы с Татьяной добиваемся встречи с сыном, но нам под самыми невероятными предлогами в этом отказывают. Считаю, что это — моральное издевательство и своеобразная пытка по отношению к Павлу и к нам как к родителям. Даже к бандитам относятся лояльнее. Я говорил, говорю и буду говорить: виновные судят невиновного. Забрали сына и даже показать родителям не могут. Разве это морально? Он стекла не бил, двери не ломал, не хулиганил… А то, что пошел на Площадь, — это его право. Он живет в родной стране. Эта земля — наша, наших предков, политая их потом и кровью. И никто не вправе запрещать нам ходить по этой земле, не потупив глаза. Мы всегда честно смотрели и смотрим людям в глаза. Также и Павел. Поэтому наша семья уверенно чувствует себя. Даже на тех же нарах, когда совесть чиста, спишь спокойно, а когда ты с совестью не в ладах, тогда и в пуховой постели будут кошмары сниться. Поэтому я солидарен со своим сыном. И еще раз заявляю: он абсолютно ни в чем не виновен. А вот тех людей, что устроили эту провокацию, мне искренне жаль.

Да и народ порядком запуган. То, что сейчас творится с политзаключенными и общественными активистами, в голове не укладывается. Моральность — на самом низком уровне. Экономику можно быстро возродить, заводы можно поднять за короткое время, а вот мораль и душу человека, которые уродует нынешний режим, очень сложно будет менять и исправлять.

— **С высокой трибуны была озвучена версия, что на прошедших выборах многие кандидаты якобы "отрабатывали" деньги своих спонсоров, поэтому и не смогли договориться о совместных действиях?**

— Тогда у меня возникает резонный вопрос: если вы знаете, что откуда-то поступают деньги, почему их не конфисковали предварительно? В противном случае не стоит педалировать эту тему. Есть у нас спецслужбы, есть таможня, милиция… Работайте на опережение. А не по принципу "одна баба говорила, а другая слушала". Хотя все эти вопросы — риторические.

— **Или возьмем, к примеру, гараж, что показывали по БТ, напичканный каким-то мусором строительным и чем-то типа оружия, якобы предназначенного для свержения режима…**

— Уже выяснилось, что тот пресловутый гараж принадлежит сотруднику спецслужб. И опять-таки вопрос: кто допустил, что в нашу страну вся эта дрянь была ввезена? Если уж на то пошло. Но мне не хотелось бы до судов над политиками вообще что-то комментировать по этому поводу. Как бы не навредить узникам… Одно могу сказать: мы единственная в мире страна, где обычные выборы объявлены заговором и попыткой свержения власти.

— **Как можно объяснить ситуацию, когда кандидат в президенты Рымашевский выпущен из СИЗО, а начальник его предвыборного штаба Северинец по-прежнему в "американке"?**

— Ну, это вопрос к следствию. Они там решают… Хотя, полагаю, все у нас решает один-единственный человек: как прикажет, так и будет. И это обстоятельство позволяет мне думать, что далеко нам еще до правового государства.

— **События в арабском мире белорусские власти по-своему преподносят народу. Дескать, вот до чего доводят революции. Значит, сидите и молчите как мыши под веником…**

— Из истории известно: все диктаторы заканчивают свое правление бесславно. Исключений не бывает. Коль человек долго у власти, будь хоть трижды золотым, наступает усталость от него. Да и сам он обрастает родством, связями, становится заложником окружения… Главный белорусский начальник всем своим поведением, как я думаю, показывает пренебрежительное отношение к народу. Бить себя в грудь и клясться в любви к людям — одно. А вот вести себя достойно, пристойно, морально — другое. Поэтому можно сделать вывод, что власть потеряла берега...

— **И что же делать?**

— Будем надеяться, что этот режим недолговечен...

— **Получается, надо ждать лет 30, как у арабов? Половина срока уже прошла…**

— Кто знает? Такая вот беда с нами приключилась. Во многом наверняка и сами мы виноваты, что долго холопствуем, раболепствуем...

— **Представим себе Беларусь без Лукашенко. Не ввергнется ли она в хаос приснопамятных 90-х?**

— Я, конечно, не специалист, но, на мой взгляд, есть такая опасность. Ведь сегодня страна живет не по средствам. Кредитов набрали, а скоро придется их отдавать. Способна ли нереформированная экономика справиться с такой нагрузкой? Всяко может быть. Не исключаю, что иные будут страдать по лукашенковским временам, не понимая того, что именно сейчас мы забрели в такой тупик, из которого трудно выбраться.

— **Достаточно ли уделяют внимания негосударственные СМИ судьбе политзаключенных?**

— Можно сказать, достаточно. Чувствую это по своей семье. Журналисты звонят постоянно, интересуются нашими делами, судьбой Павла. За что им огромная благодарность. Вот и эта наша беседа подтверждает, что мы не одиноки. Вместе — выстоим! Думаю, что волна протестов не будет спадать как в стране, так и за рубежом...

**Беседовал Владимир ЖИГУЛОВ.**

УЧОРА

## Кіргізы — Лукашэнку: «Пабойся Бога!»

*У сталіцы Кыргызстана ля будынка пасольства Беларусі ўчора праходзіў пікет.*

Арганізаваў акцыю грамадскі рух "7 красавіка". Людзі трымалі ў руках плакаты, на якіх напісана: "Курманбек, вярніся і адказвай!", "Лукашэнка, пабойся Бога!", "Выдайце Бакіева!", "Так жыць нельга!", "Дзе злачынец?".

Людзі, якія сабраліся, патрабавалі экстрадыцыі Курманбека Бакіева ў Кыргызстан.

Як днямі паведаміла прэзідэнт краіны Роза Атунбаева, Бакіеў да цяперашняга часу застаецца ў Мінску. Дакладнае месца ягонага жыхарства не раскрываецца.

НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ!



*Пётр САДОЎСКІ,*
*кандыдат філалагічных навук*

# Пасвячэнне ў «крыжаносцы»

*Праваслаўная царква ўганаравала Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь харугвай з выявай Хрыста Збаўцы. Цырымонія трансліравалася па дзяржаўным тэлебачанні. Перад урачыстым канцэртам, прысвечаным Дню міліцыі, Мітрапаліт Філарэт перадаў міністру Куляшову харугву з відарысам аблічча Хрыста Збаўцы, прамовіўшы з гэтай нагоды ўрачыстую малітву і акрапіўшы харугву святой вадой.*

## З намі Бог!

Звяртаючыся да залы, што была запоўнена абранай публікай — архіепіскапамі, епіскапамі, вікарыямі, сілавікамі ў форме і цывільным, дзяржслужбоўцамі, дэпутатамі, кіраўнік праваслаўнай царквы пачаў прамову ўрачыстымі словамі: *“Наша страна процветает усилиями многих людей. Ваш труд — сохранение Отечества от посягательства злоумышленников — можно назвать крестным...”* Пасажы з выверыных сінтагмаў Мітрапаліта гучалі ў прыціхлай зале як вібрацыі стальных струн і па заканчэнні выступлення былі ўвенчаны шматгарлавым урачыстым выгукам спеўнай групы, што выстраілася на сцэне: “С нами Бог!”.

Сам працэс перадачы харугвы (тут, пэўна, патрэбны быў цалавальны рытуал) апаратары неяк змазалі. Магчыма, было нешта выразана. (У пазнейшых тэлепаўторах гэта ўвогуле не паказвалі.) У параўнанні з урачыстай прамовай Мітрапаліта міністэрскае слова ў адказ слухалася вельмі будзённа і нават сарамяжліва. У інтэрв’ю для партала sobor.by міністр выглядаў больш рэспектабельна і вымавіў сказ, які ў той жа вечар быў вынесены на афіцыйныя сайты: *“Нравственный верующий человек всегда будет дружен и с законом...”*

Можна яшчэ дадаць, што — паводле афіцыйнай інфармацыі — *“передача хоругви была совершена по инициативе Министерства внутренних дел”* і што *“замысел освящения воинского знамени родился во время акции “Семья — служим вместе” в рамках проведения программы “Семья — единение — Отечество”.*

Пераказваю ўсё так амаль фатаграфічна і нейтральна, таму што хачу, каб той, хто не бачыў той урачысты сход, змог паразважаць разам з намі: што ж адбылося ў той вечар у Палацы Рэспублікі? Што стаіць за гэтым знешнім урачыстым актам яднання царквы з міліцыяй у гэтыя складаныя для нашай краіны дні?

## Блаславенне зла — тут і цяпер

У першы год свайго прэзідэнцтва Лукашэнка заяўляў, што не стаў прыхільнікам беларускай нацыянальнай ідэі, фармуляванай папярэднікамі, і лічыць (хоць і як “праваслаўны атэіст”) хрысціянскія каштоўнасці найбольш прыдатнымі ў якасці складнікаў сучаснай самаідэнтыфікацыі беларускіх грамадзян. (Тут мы не ўдаёмся ў супярэчнасці выказвання: ранейшая нацыянальная ідэя не адмаўляла хрысціянскіх каштоўнасцяў.) У наступныя гады праваслаўная царква неадступна “суправаджала” і асвячала Лукашэнку, калі ён рухаўся па лесвіцы аўтарытарызму. На інаўгурацыі 2006 года Мітрапаліт настаўляў *“сэкулярнага суверэна”* не як евангельскі пастар, а як бязлітасны старазапаветны Давыд свайго сына Саламона: *“Будзь цвёрды і мужны. Ідзі ўпэўненым крокам. Барані Айчыну і зямлю нашу ад зламыснікаў...”* Не дачакалася грамадства ад царквы ні дыялогу з іншадумцамі, ні слоў спачування родным зніклых палітыкаў, ні ацэнкі дзяржаўных ілжэсведчанняў у час выбараў, ні асуджэння (ці хаця б ціхага мудрага настаўлення) кіраўніка дзяржавы за яго публічныя абразы апанентаў і моўнае хамства, маральнае распуства...

І вось раптам — вяршыня цынізму: евангельскае маўчанне перарастае ў бласлаўленне зла. Святая харугва перадаецца міліцэйскаму воінству, чый галоўны начальнік узяў пад казырок і загадаў чыніць крывавую бойню! Акурат цяпер, калі ідуць вераломныя суды, калі ўвесь цывілізаваны свет патрабуе вызвалення вязняў і пакарання службовых асоб, якія перавысілі свае паўнамоцтвы і татальна парушылі правы грамадзян на свабоднае волевыяўленне. Лічу, праваслаўная царква на чале з Мітрапалітам канчаткова страціла свой твар. Яе літаральна згвалцілі, або, як бы сказаў Лукашэнка, — “нахілілі ды апусцілі”. Думаецца, што царкоўнае начальства сціпла папрасіла, каб у афіцыйным тэксце напісалі, што *“перадача харугвы была здзейснена па ініцыятыве МУС”.*

Вуснамі галоўнага святара Беларусі гвалтоўныя дзеянні міліцыі кваліфікуюцца як “крестный труд”! Вось прыйдуць у Маскоўскі суд 15 міліцыянераў-сведак і будуць суддзям дэманстраваць “цялесныя пашкоджанні”, якія ім нанеслі 2 юнакі голымі рукамі. Вось які цяжкі крыж нясуць “шчытаносцы”. Як жа ім не паверыць. Іх пакуты асвечаны высокім царкоўным санам. Яны не могуць быць ілжэсведкамі: з імі Бог! Мы і з Богам, і з зак онам можам дружыць, кажа іхні начальнік. Задумайцеся: дружыць з законам! Дружба — справа вольная: хачу — дружу, хачу — не дружу. Міліцыя павінна служыць і жыць, паводле закону. А тут выходзіць: міліцыянты будуць сябраваць і з Богам, і з суддзямі. Вось лукашэнкаўска-куляшоўская інтэрпрэтацыя хаўрусу Бога і міліцыі.

У той вечар, 4 сакавіка, тэлегледачы чакалі паказу інтэрв’ю Лукашэнкі газеце “Вашынгтон Пост”. Урачысты вечар, прысвечаны Дню міліцыі, быў паказаны перад гэтым гадзіны за паўтары. Дух *“бажэсьцьвеннага”* міліцэйскага вечара і атмасфера гутаркі Лукашэнкі з замежнай карэспандэнткай былі вельмі падобныя: той жа цынізм, тое ж жангліраванне словамі. Лукашэнка пачуваў сябе свабодным ад усялякіх хімераў сумлення і логікі: не ведае, у якой сям’і вязняў трохгадовы сын; адзін кандыдат у прэзідэнты патрабаваў ягонага павешання; у Беларусі выбары ў разы дэмакратычней, чым у Амерыцы... З Лукашэнкам на інтэрв’ю быў таксама ягоны ўласны бог, бог “праваслаўнага атэіста”, які дазваляў яму і раней бессаромна лгаць і плесці ўсякую несянесіцу: мой бацька згарэў у танку; па мне шмат разоў стралялі; Быкаў пісаў вершы; Скарына тварыў у Піцеры; у Гітлера было не ўсё дрэнна...

Быў такі адзін дзяржаўны дзеяч мінулага, які абяцаў сваім грамадзянам: “Я зраблю ваша жыццё лягчэйшым. Я вызвалю вас ад залішняга розуму і хімеры сумлення!”. Ягонае воінства напісала тады сабе на спражках тры словы “З намі Бог!” і замаршыравала ў ганебны паход, які каштаваў чалавецтву дзясяткі мільёнаў жыццяў.

## Што ж вы, браткі-святары?

У той жа вечар пасля ўрачыстага сходу патэлефанаваў я знаёмаму праваслаўнаму святару. Час ад часу мы гутарым з ім на царкоўныя тэмы. Апошні раз мы сустракаліся з ім у Палацы мастацтва на лекцыі Андрэя Кураева, які ў почаце Мітрапаліта Кірыла прыязджаў ў Мінск. Пра вельмі своеасаблівую лекцыю Кураева ў Палацы мастацтва пісала ў свой час і “Народная Воля”. Мой знаёмы — чалавек адукаваны, шчыры, але асцярожны. Зразумеўшы тэму нашай магчымай гутаркі, ён не выказаў асаблівай гатоўнасці абмяркоўваць учынак Мітрапаліта Філарэта, спаслаўшыся на тое, што яму гэта рабіць не вельмі этычна ды і перадачу ён не глядзеў. Ды і ўвогуле, кажа, час зараз не той, каб па тэлефоне такія тэмы абмяркоўваць. Вось так.

Мы неяк больш схільныя крытыкаваць праваслаўную царкву за хаўрусаванне з уладамі. Як па мне, дык — чым астатнія лепшыя? Каталікі тыя, праўда, на беларускай мове часам казані кажуць. А так — мала чым ад праваслаўных адрозніваюцца. Харугваў, праўда, пакуль не падносілі, але гэтак жа лагодна, як і праваслаўныя, Лукашэнку прымаюць, слухаюць прыхільна ягоныя не надта ўмесныя тырады, па-сяброўску пасміхаюцца. Гэткая дыпламатыя тут недарэчы. Можна ж калі-небудзь хворым прыкінуцца, ды, калі ты вялікі начальнік, на сустрэчу свайго намесніка прапанаваць. Ёсць у мяне знаёмыя і сярод пратэстанцкіх прасвітараў. Яны больш аб працоўнай аскезе ды пра сям’ю гавораць. Але ж гэтага мала. Хто ж з нашых святароў, як калісьці Ян Павел ІІ, скажа: **“Не бойцеся!”.** Чаго ж святарам баяцца? Яны ж не на кантракце ў Лукашэнкі працуюць.

Калі-нікалі здараліся прасвятленні ў нашым праваслаўным афіцыёзе. Можа, хто здзівіцца, калі я скажу: з цікавай прамовай выступіў Мітрапаліт Філарэт на Усебеларускім народным сходзе ў 2010 годзе. Узгадайце, што ён гаварыў пра мараль, настаўнікаў, дактароў і суддзяў. Ён гаварыў у біблійнай парадыгме. Аднак маўчанне і практычнае бяздзеянне царквы настройвала на негатыўнае ўспрыманне любога выказвання. Да таго ж: з высокай трыбуны мы чакаем толькі цынічны змест, ужо не спадзеючыся, што нехта будзе шчыра гаварыць. Тады разумная думка Мітрапаліта не была заўважана, бо, відаць, была занадта “герметычна” сфармулявана. На інаўгурацыі 2010 года Мітрапаліт пажадаў Лукашэнку мудрасці ў дзяржаўнай дзейнасці. Гэта ўжо лепш, чым “цвёрды поступ”. Станоўчую рэакцыю грамадскасці выклікала заява групы праваслаўных вернікаў у абарону зняволеных пасля 19 снежня. Аптымісты пачалі ўжо гаварыць пра пэўную адлігу ў жыцці праваслаўнай царквы, з’явіліся асцярожныя аптымістычныя агляды ў інтэрнэце. І тут вось раптам — харугва для Куляшова!

Я не ведаю, ці спавядаюцца святары перад смерцю і як яны палагоджваюць сваё сумленне, калі ў апошнія хвіліны жыцця ўзважваюць свае словы і ўчынкі? Канечне, агульны баланс дзейнасці шараговых святароў станоўчы, калі глядзець “па пладах і па зернях”. Але, калі яны высокія іерархі і працягла “не аблічаюць грэшнікаў” (што патрабуе Святое Пісьмо) і тым больш публічна асвячаюць злачынства, тым самым спрыяючы дэградацыі грамадства, — хто асмеліцца сказаць, што іх промысел праведны. Цень крывавых падзей 19 снежня стаіць чорнай хмарай над беларускім МУС і ягоным галоўным начальнікам, уганараваным чарговай генеральскай зоркай з рук галоўнага свецкага начальніка Беларусі. Цяпер вось ягоныя подзвігі ўжо асвячаюцца іменем Бога.

Цынізм чалавека ва ўбранні святара — больш небяспечны, чым ілжа свецкага начальніка: генсекі, прэзідэнты прыходзяць і адыходзяць. Ідэя Боскай справядлівасці вечная. Яе разумее падсвядома і нехрышчоны, і неўцаркоўлены, хаця і не можа для гэтага знайсці слушныя словы. У бядзе, у хваробе, неабаронены сярод цёмнай ночы самы слабы грэшнік набліжаецца да Бога. “Падзенне” святара — сігнал і страшэнна дзейсны чыннік дэградацыі грамадства. Сціраецца мяжа паміж дабром і злом.

ЧУЛІ?

## ...Як некалі Пiначэта

*Як паведаміла брытанская газета The Independent, вядучая юрыдычная фірма Вялікабрытаніі H2O Law збіраецца падаць іск супраць “прэзідэнта былой савецкай рэспублікі Аляксандра Лукашэнкі”, паколькі мае “доказы аб сістэматычных катаваннях у турмах беларускага КДБ”.*

Па словах брытанскіх юрыстаў, у аснове гэтых доказаў ляжаць апытанні сотняў актывістаў, арыштаваных пасля *“спрэчных прэзідэнцкіх выбараў”.*

Кіраўнік прэс-службы прэзідэнта Беларусі Павел Лёгкі, каментуючы гэтую навіну, заклапочанасці не выказаў. Па яго словах, іск брытанскіх юрыстаў супраць прэзідэнта Беларусі з’яўляецца рэкламным пшыкам.

*“Перспектывы ў гэтай задумы — нулявыя. Гэта насамрэч не больш чым піяр-акцыя спадароў юрыстаў. Гэта толькі спосаб хоць неяк звярнуць на сябе ўвагу, карыстаючыся вядомасцю беларускага лідара і палітычнай вастрынёй сітуацыі. Я думаю, што і самі арганізатары выдатна разумеюць, што гэта пусты рэкламны пшык. А вось The Independent, не разабраўшыся ў сутнасці пытання, папросту купілася на танны трук. Іміджу сур’ёзнага выдання падобнае, на мой погляд, проста шкодзіць”,* — заявіў Павел Лёгкі ў інтэрв’ю БелаПАН.

Але юрысты прытрымліваюцца іншага пункту гледжання. Паводле міжнародных дамоў, за ўжыванне катаванняў існуюць працэдуры прыцягнення вінаватых да адказнасці. Гэта так званая ўніверсальная крымінальная юрысдыкцыя. Яна дазваляе краінам незалежна ад таго, дзе ўчыняліся міжнародныя злачынствы, звязаныя з бесчалавечным стаўленнем да людзей, разглядаць іх у нацыянальных судах. У Вялікабрытаніі адмысловыя грамадскія аб’яднанні і адвакаты ўжо выкарыстоўвалі для гэтага юрысдыкцыю сваёй краіны. Так, праваабаронцы згадваюць, што менавіта ў Лондане адбываліся першыя судовыя слуханні па справе Пiначэта, якога пазней арыштавалі на падставе рашэння суда ў Іспаніі.

**Алег СНОЎ.**

## ДАІ ладзіць аблаву

*Супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі, транспартнай інспекцыі Міністэрства транспарту і камунікацый і УП "Белтэхагляд" з 10 па 20 сакавіка праводзяць на дарогах Беларусі масавыя праверкі аўто на наяўнасць дакументаў аб праходжанні тэхагляду.*

Ва УП "Белтэхагляд" рэкамендавалі кіроўцам не адкладаць візіт на станцыю дыягностыкі, а таксама не карыстацца паслугамі сумніўных асоб, якія прапануюць падробленыя дакументы аб праходжанні тэхагляду.

За кіраванне транспартным сродкам, які не прайшоў дзяржтэхагляд своечасова, згодна з заканадаўствам, з аўтаўладальнікаў будуць спаганяць штрафы ў памеры да дзвюх базавых велічынь — 70 тысяч рублёў.

ОБ ЭТОМ — ВПЕРВЫЕ!

# Ядерный транзит

Мы часто вспоминаем о трагедии, которая постигла нас 25 лет назад, — об аварии на Чернобыльской АЭС. Ее последствия еще долгие годы будут сказываться в политической, экономической и социальной жизни государства. Нет необходимости говорить об особом отношении белорусов к атомной энергетике. Это наглядно проявляется в их неоднозначной реакции на решение о строительстве АЭС. С одной стороны, очевидно, что сокращение "энерго-политической зависимости" от поставок углеводородного сырья из любых источников существенно повышает уровень экономической безопасности страны, создает новые рабочие места, стимулирует обучение и привлечение высококвалифицированных специалистов. С другой стороны, наличие потенциально опасного объекта на нашей земле вызывает рост протестных настроений по вполне понятным причинам — память о последствиях чернобыльской трагедии живет уже на генном уровне.




Вместе с тем имеются радиационные риски не столь очевидные для подавляющего числа наших граждан: это применение радиоактивных источников в промышленности, медицине, научных исследованиях. Количество их достаточно велико, но они находятся под тщательным контролем соответствующих служб: Госатомнадзора в структуре МЧС, Министерства здравоохранения, МВД. Применение источников излучения жестко регламентировано и реальной опасности для населения не представляет.

Но существует еще один вид деятельности, сопряженный с радиационной опасностью, — транзит через Беларусь грузов, содержащих ядерные и радиоактивные материалы.

Наша страна занимает уникальное геополитическое положение, являясь транзитной территорией на путях перемещения транспорта, пассажирского и грузового сообщения по встречным направлениям "восток-запад" и "север-юг". Будучи участником международных соглашений и конвенций о нераспространении оружия массового уничтожения, предотвращения оборота наркотиков и незаконной торговли людьми, Беларусь взяла большую ответственность за недопущение подобного рода деятельности. Помимо защиты собственной национальной безопасности, государство служит своеобразным "санитарным кордоном" для сопредельных стран. Особое место в этой деятельности занимает контроль над передвижением через нашу территорию опасных грузов, в том числе содержащих ядерные и радиоактивные материалы.

Наша страна свободна от наличия ядерного оружия. В свое время было принято важное решение о выводе ядерных боеприпасов с территории Беларуси в обмен на гарантии безопасности со стороны стран, обладающих подобным оружием. Вывод был завершен в 1996 году. Это исключило возможные радиационные происшествия на нашей земле да и колоссальные материальные и технические сложности, связанные с обслуживанием подобных систем (в России численность персонала, занятого в обслуживании ядерного оружейного комплекса, составляет более миллиона человек), и получило безусловное одобрение со стороны мирового сообщества.

Вместе с тем существование в Калининградской области России мощной военной группировки не исключает возможности транзита через нашу территорию ядерного оружия. Естественно, перемещение таких грузов осуществляется со всеми мыслимыми мерами безопасности да и требует согласования на самом высоком уровне.

Одним из видов радиационно опасных грузов является свежее и отработанное ядерное топливо для атомных электростанций, перевозка которого осуществляется, как правило, железнодорожным транспортом в специальных вагонах. Такие поставки производятся на основании контрактов между странами ЕС и российскими производящими и перерабатывающими предприятиями (транзит).

Также существует довольно интенсивный поток грузоперевозок, при которых осуществляется поставка радиоизотопной продукции для промышленных, медицинских и научных целей. В основном пунктами отправления и получения радионуклидов являются российские фирмы (опять транзит).

Естественно, в нашей стране также существуют потребители и производители источников излучений. Без них немыслим ряд технологических процессов в промышленности, проведение лучевой терапии и радиографии в медицине, проведение научных исследований. Успешно развивается предприятие "Изотопные технологии", расположенное в Соснах и являющееся в Беларуси единственным производителем этой сложной продукции. Наряду с поставками радиопрепаратов для нужд отечественных потребителей фирма активно осваивает зарубежный рынок.

Все перечисленные выше перевозки осуществляются законно, легальным путем, при соответствующем жестком контроле, наличии сопроводительных документов, и поэтому поддаются учету и наблюдению. Но в последние годы возник новый, "черный" рынок, причем на международном уровне — контрабанда ядерных и радиоактивных материалов. Этот рынок существует, как ему и положено, при наличии спроса и предложения.

В умах руководителей международных террористических группировок уже давно существовали безумные идеи обладания ядерным или радиологическим оружием для шантажа мирового сообщества. И если утечка и применение ядерных боеголовок являются фантастическими проектами, то создание так называемых "грязных" радиологических бомб куда более реалистично. Требуется "всего-то" наличие приличного заряда взрывчатки (чего у террористов в избытке) и определенного количества радиоактивных веществ, достаточного для радиационного заражения определенной территории со всеми вытекающими последствиями. То есть спрос есть.

Есть и предложение. Это в первую очередь связано с распадом СССР, наличием в странах СНГ производственных и научных центров, которые существенно потеряли контроль над ядерными технологиями, и с их тяжелым экономическим положением. Соблазн легкой наживы да и бедственное положение людей, имевших (или имеющих) отношение к атомной промышленности, толкает их на нелегальную торговлю радиационно опасными материалами. (Кстати, несколько попыток сбыта изотопных источников было пресечено нашими правоохранительными органами на территории Беларуси, о чем сообщалось в прессе.)

И потек "ядерный" ручеек. Непрофессионалы — кто в ручной клади (!), кто в багаже — пытаются доставить опасный груз к покупателям. Специалисты действуют более изощренно: размещают радиоактивные вещества в специальные защитные контейнеры, маскируют его в сопутствующих предметах — в металлоломе, строительных материалах и т.д. Самые грамотные попросту производят подмену содержимого "легальной" поставки с настоящими разрешительными документами и накладными, закладывая в транспортный контейнер завышенное количество радиоактивного вещества или иного изотопного состава (кто же на таможенном посту его, запломбированного, вскроет, взвесит и проанализирует?).

Но не будем нагнетать обстановку — все не так уж и страшно. На самом деле, начиная с 1995 года наши таможенные пункты начали постепенно оснащаться специальной контрольной аппаратурой для выявления нелегального перемещения делящихся и радиоактивных веществ через границу. На первом этапе использовались установки, поставляемые из США в рамках закона Нанна-Лугара (закон США об оказании помощи странам СНГ в нераспространении оружия массового поражения). Затем в Таможенном комитете России была создана отдельная служба контроля над ядерными и радиоактивными материалами. В те времена, когда таможенники Беларуси и России работали совместно на западных границах, было принято решение о создании национальных средств контроля. Разработки велись, как сейчас принято говорить, "в инновационном порядке" белорусским предприятием "Полимастер" при существенном финансировании со стороны ГТК России. Следует заметить, что все попытки достучаться до соответствующих государственных структур (начиная от Совета безопасности, ГКНТ, МВД, КГБ и заканчивая Госкомчернобылем) в плане оказания поддержки оказались безрезультатными. Как результат, правообладателем на серийный выпуск ряда приборов стала Россия, которая широко использует в своих таможенных службах. Кстати, благодаря совершенно неформальному подходу со стороны весьма серьезных организаций РФ, специалисты "Полимастера" были допущены в святая святых российского оборонного комплекса, расположенного на Урале, что позволило провести разработку приборов в реальных условиях. Именно благодаря этому сейчас западные и южные границы нашей страны "прикрыты" аппаратурой радиационного контроля, соответствующей требованиям МАГАТЭ, и отвечают всем стандартам России, стран ЕС и США.

Ну а как обстоит дело на остальном периметре страны? Наибольшую границу мы имеем с Российской Федерацией, а отсюда — и объективно наибольшая вероятность ввоза на нашу территорию опасных грузов. Границы открыты для ввоза радиоактивной контрабанды. Со стороны Украины оборудованы три таможенных пункта. Тем не менее опасные грузы и предметы из загрязненных территорий России и Украины потихоньку попадают на нашу землю. Понятно, что государственные границы на этих направлениях стационарно не обустроены и не имеют строгого таможенного режима, но оснастить измерительной аппаратурой основные посты ГАИ имеет смысл. В таком случае радиационный контроль охватит в основном весь периметр страны.

И тут возникает еще один аспект радиационной безопасности страны. Стоит напомнить, что Беларусь окружена действующими АЭС в России и в Украине (да и на Игналинской АЭС в Литве остается ядерное содержимое). Еще в 1995 году с участием представителей Совета безопасности, Академии наук, предприятия "Полимастер" и американских участников проекта Нанна-Лугара было проведено совещание, на котором признано целесообразным при наличии замкнутого периметра радиационного контроля создать систему раннего оповещения в случае аварийных инцидентов на окружающих АЭС. Но не завершили оборудование всей границы, не довели эту идею до реализации...

Может, все-таки имеет смысл вернуться к этому проекту, замкнув его на соответствующие ведомства? В этом случае мы не повторим трагические ошибки, которые были допущены в ходе развития чернобыльских событий, не будем ждать беды с закрытыми глазами, а сможем четко реагировать на возможные неприятности!

**Юрий ГАВРИЛОВ,**
**научный обозреватель.**

# Ніл ГІЛЕВІЧ: з новых вершаў



## Спыталі мужчыну

**Яўгену Стасевічу**

*Спыталі мужчыну, што доўга пажыў:*
*— Скажы нам: а чым ты ў жыцці даражыў,*
*Як Божай любоўю праўдзівай?*
*— Сям'ёю. Сябрамі. Радзімай.*

*— Што першай апорай было для цябе,*
*Калі апынаўся ты ў смутку-журбе*
*І скруха душу халадзіла?*
*— Сям'я. І сябры. І Радзіма.*

*— А што і каго ты тады ўспамінаў,*
*Калі непаўторна штораз пражываў*
*Святлістага шчасця гадзіну?*
*— Сям'ю. І сяброў. І Радзіму.*

*— Каму ты, утомлены шляхам зямным,*
*Апошні паклон аддасі — перад тым,*
*Як Бог да сябе цябе прыме?*
*— Сям'і. І сябрам. І Радзіме.*

31.X.2010

## Ну што, беларусы?

*Адна вучанічка на ўвесь Магілёў*
*Просіць душу ўратаваць ад загубы*
*Роднаю мовай... Ды пан з халуёў*
*Крывіць ва ўхмылцы пагардлівай губы.*
*Адно — на Гародню на ўсю — дзеўчанё*
*Просіць душу ўратаваць ад загубы*
*Роднаю мовай... Але чынаўё —*
*Ні вухам, ні духам! "Не мецьмем рахубы!"*

*Ну што, беларусы? Дайшлі-дажылі?*
*Думаем: Бог нам паможа прамілы?*
*І на святой нашай роднай зямлі*
*Долю і волю дадуць нам грамілы?*
*Ці дзвюх вучанічак да мовы любоў*
*Не дасць нам усім абярнуцца ў рабоў?*

2010, лістапад

## Натуральнае законнае жаданне

**З ліста адной вельмі далёкай ад палітыкі беларускай жанчыны**

*Паночкі! Даруйце! Я — простая баба*
*І ў справах дзяржаўных кумекаю слаба,*
*А можна сказаць: і зусім не кумекаю, —*
*Ну гэткаю вырасла ў Бога няўмекаю.*

*Мне добра жывецца, і есца, і п'ецца,*
*І муж не дае мне адстаўку, здаецца,*
*І любяць суседзі, і цэняць на працы,*
*І дзеткі — усе пры дай Божа зарплаце...*
*Адно мне нялюба: чаму ў тэлевізары*
*Блішчыць і блішчыць гэны чэрап залізаны?*
*Няўжо ў нас няма, каб і гэткі ж быў бравы*
*І гэткі ж разумны, але — кучаравы?*

18.X.2010

## Як мала...

*Як мала*
*за мову зямлі беларускай*
*пакутнікаў!*
*Як многа*
*ахвочых па ёй патаптацца*
*паскуднікаў!*

*Як мала*
*за нашу душу беларускую*
*ратнікаў!*
*Як многа*
*ад гэтай душы адшчапенцаў*
*і здраднікаў!*

2010, лістапад

## Ведаючы...

*Ведаючы, у якім ты чыне*
*І што род твой звеку не дурны,*

*Раю як салдату і мужчыне:*
*Выпусці студэнтачку з турмы!*

*Хіба ж гэткіх бэсцяць нізавошта?*
*Асыпаюць лаянкай брыдкой?*
*Гэткіх трэба ружамі на плошчы*
*Асыпаць з любоўю трапяткой!*

25.XII.2010

***

*Адкуль яны толькі бяруцца —*
*Цынічныя, жорсткія, прагныя,*
*І хрысцяць сябе Беларуссю,*
*Як самыя ў свеце сапраўдныя?*

*І пруцца, і пнуцца, і лезуць —*
*У кожную залу трыбунную...*
*О дзе ты, заступнік наш Езус?*
*Ці бачыш ты дзейнасць іх бурную?*

11.XII.2010

## Эпілог

**да збору твораў у 23 тамах**

*Ну, вось і ўсё! "На гэта звалі".*
*Што меў зрабіць — зрабіў як мог.*
*Ці ўсё па-боску, па прызванні?*
*Пра гэта знае толькі Бог.*

31.XII.2010

Народная Воля http://www.nv-online.info
11—14 САКАВІКА 2011 г.

БОЛЬ

# Даруй, родная хата...

З восені не быў на сваёй радзіме — у невялікай лясной вёсачцы на Любаншчыне з назваю Жывунь. Яе лёгка знайсці на мапе ў тым месцы, дзе сталічная вобласць мяжуецца з Магілёўшчынай ды Гомельшчынай.

Людзі сталага пакалення добра ведаюць гэтыя мясціны. Тут пачынаўся партызанскі супраціў, тут у чатырох кіламетрах праз балота знаходзіўся першы і самы буйны партызанскі аэрадром — Зыслаў.

Многа знакамітых людзей бывала калісьці ў нашай бацькоўскай хаце — нават дзед Талаш. У вайну тут быў штаб брыгады, за што ў сорак чацвёртым хата і спалена. Пацярпелі і гаспадары. Дзеда Хведара расстралялі перад усёй вёскай за сувязь майго бацькі з партызанамі. Данесла аднавяскоўка... Ад перажытага на трэці дзень адышла і бабуля. І даўно няма ні той жанчыны, ні яе трох сыноў і ўнукаў...

Скончыліся гады ліхалецця, усё трэба было ладзіць нанова. Упрогшы ў ярмо нямецкую чорна-белую рагулю, гаспадары вазілі лес і адбудавалі на тым жа месцы новую сядзібу. Нарадзілі яшчэ двух дзяцей, у тым ліку і мяне. Мы — і дзеці, і дарослыя — заўсёды ганарыліся сваёй вёскай. Яна не скарылася ворагам і была свабоднай ад захопнікаў, за выключэннем некалькіх дзён карнай аперацыі.

Кожны год на Радаўніцу ездзіў на могілкі да бацькоў і прадзедаў, нават калі працаваў на Поўначы. Аднойчы ж не змог прыехаць, і вось бяда — у гэты час памерла цешча. На душы было неспакойна: у снах мроіліся нейкія чорныя постаці, што швэндаліся па садзе пад разгалістымі яблынямі, пасаджанымі ці то дзедам Хведарам, ці, можа, яшчэ прадзедам Максімчыкам. Яблыні радзілі кожны год, яблыкі былі раннія — і з кіслінкаю, і салодкія (жытнікі). Мяне цягнула дахаты, дзе нарадзіўся, дзе бегаў з равеснікамі па лесе і па балоце, дзе з'язджаў на самакаце з жалезных гнутых прутоў у глыбокія яміны ад нямецкіх бомбаў, якія, помню, роўна ў дзесяць раніцы на працягу месяца кідалі чужыя самалёты...

На пачатку лета з унукам завітала малодшая дачка, і вырашылі з жонкаю ўсім разам наведацца на маю радзіму. Дарога невялікая — 70 кіламетраў. Стаяў сонечны дзень, шаша была пустая і роўная.

Могілкі ляжалі перад вёскай, амаль паабапал дарогі ў сасновым ляску. Навокал усё чыста прыбрана, з'явілася новая драўляная агароджа. Пакланіліся родным і знаёмым і паехалі на свой двор.

Але што гэта робіцца ў суседзяў на пачатку вуліцы? З неабрэзаных, рознай вышыні дошак узнімаўся плот метры ў тры. Уражанне, нібыта трапіў у сярэднявечча ці ў абарончы лагер Ермака пры заваяванні Сібіры... Каля хаты завіхаюцца трое хлопцаў. Пытаюся, чые яны, што робяць на чужым паселішчы. З неахвотаю адзін уступае ў размову. Аказваецца, яны з суседняй вёскі, працуюць на нейкага фермера з раёна. А на двары памерлых ужо суседзяў разбіраюць летнюю кухню, закладваюць фундамент сховішча для новага гаспадара. Пад вокнамі хаты кучы будаўнічых матэрыялаў, жалезныя бочкі з дызельным палівам, з калодзежа помпа гоніць ваду на месца будаўніцтва.

Заходзім у свой двор. Бачым паваленую чаромху, зараснікі рознага кустоўя. А ў хаце нехта "пагаспадарыў": лічыльнік і выключальнікі зрэзаны. Уся мэбля знікла, адзіны матрац валяецца на падлозе ды сіратліва стаіць пустая шафа ў куце. Выходзім, кіруемся ў сад. Саду больш няма. Пасаджаныя пасля вайны яблыні, грушы, слівы і стогадовыя дрэвы спілаваны пад корань. Усё выгараджана новымі высачэзнымі слупамі па самы хлеў. Выразаны і суседскі сад. Мабыць, цяпер замест двароў і садоў будуць нейкія фермы, можа, нават і стравусіныя...

Побач пусты выган, далей за шашою лес. Колькі навокал пустуючай зямлі! Дык навошта бурыць паселішчы, часцінку былога? Розум не ўспрымае такога дзікунства, такой непавагі да памерлых і яшчэ жывых, не гаворачы ўжо пра палеглых у змаганні за гэтую зямлю, за права жыць і распраджацца на ёй нашчадкам. Моўчкі глядзяць мае памерлыя землякі на новых гаспадароў, для якіх тут няма нічога агульнага з іх душамі. Бо сапраўдны гаспадар не будзе знішчаць пладовы сад. Падрэжа сухое галлё, падкорміць — і ён заквітнее.

Пытаюся ў мясцовым Савеце: дык хто прыйшоў сюды і адкуль? Называюць нейкае прозвішча, цяжка вымаўляемае ў нашай мясцовасці. Пракуратура тут ніякага парушэння не бачыць: зямля — дзяржаўная, вы ў законным парадку сваю хату не афармілі — значыць, кінутае жыллё. Чатыры вуліцы кінутых бацькоўскіх хат. А па краіне колькі?

Даруй мне, мая радзіма, я яшчэ радзей буду да цябе завітваць, бо пераносіць такі гвалт над табою, тваёю вадою, раскіданым гняздом маіх бацькоў, маёю абрабаванай і зняважанай роднай хатай невыносна.

Іншыя часы — іншыя насельнікі, іншы парадак і расклад жыцця. Можа, так і трэба. Новыя карэнні глушаць старыя. Але што з іх праб'ецца? Адзін Пан Бог, мабыць, ведае. Затое нешта падказвае, што не будзе шчасця з разбурэння і тым, хто ператварае чужы сад у попел.

Але мая радзіма жыве — яна будзе жыць ува мне. Яна перадала мне свой дух, душу і запавет.

— Жы-ву-нь! — чую гэты няўмочны покліч. І рэха адукаецца з сасновага ляску:

— Жыву... Не...

З павагай —

**Вадзім Аляксандравіч ЛЯЛЬКІН,**
**жыхар г.Салігорска.**

РАКУРС

## В пользу Лукашенко

Выписываю газету "Народная Воля" и газету "АиФ". По Радио Свобода слушаю интересные передачи В.Карамурзы. Чтобы знать, какая сейчас путинская Россия. К сожалению, у них так же, как в Беларуси, народ для власти, а не власть для народа. Отсутствует, со слов В.Костикова, автора статьи "Брызги шампанского", курс власти к цивилизованному сожительству с собственным народом. Здоровой демократии до сего времени не существует. Там, как и у нас, авторитарная система власти. Но там того, что существует в Беларуси, нет. Там нет того плохого, что есть в Беларуси при власти А.Лукашенко. Нет, например, обмана на ТВ, как в Беларуси. Нет того страха, который поселен властью в душах белорусов. Оппоненты путинщины имеют возможность открыто критиковать Кремль.

Одним словом, пока соревнование между Путиным и Лукашенко в пользу последнего.

**Леонид РОССИЯНСКИЙ,**
**ветеран Великой Отечественной войны.**

ПРАПАНОВА!

## Наладзьце тэлетрансляцыю з Авальнай залы

У дзевяностыя гады, калі А.Лукашэнка быў дэпутатам Вярхоўнага Савета, у Беларусі, здаецца, быў толькі адзін тэлеканал. І знаходзілася магчымасць весці прамую трансляцыю з залы пасяджэнняў парламента.

Сёння ў нас шэраг тэлеканалаў. Чаму не паказваюць, як дэпутаты-палатнікі абмяркоўваюць тыя ці іншыя законапраекты, хто якую пазіцыю займае? Прапаную вярнуцца да ранейшай практыкі, калі кожны выбаршчык меў магчымасць атрымліваць інфармацыю пра свайго дэпутата, як кажуць, з першых рук.

**Мікалай АНТОНЕНКА.**
*Рэчыцкі раён.*

НА ВЫСТАВУ!

## 20 год ляціць «Пагоня»...

*"Пагоня" — назва творчай суполкі Беларускага саюза мастакоў, аб'яднаных патрыятычнай нацыянальнай ідэяй Адраджэння Бацькаўшчыны на грунце пашаны да гераічнай гісторыі, багатай культуры і самабытнай мовы нашага народа.*

Суполка, у якую ўваходзяць вядомыя майстры і таленавітая моладзь, створана на хвалі барацьбы дэмакратычных сіл за ўзнаўленне дзяржаўнасці Беларусі.

20-м угодкам творчай суполкі "Пагоня" прысвячаецца выстава ў сталічным Палацы мастацтва (вул.Казлова, 3. Адкрыццё — 11 сакавіка ў 17.30).

Арганізатары выставы сардэчна запрашаюць усіх аматараў беларускага мастацтва.

## Не забывайце знакамітых людзей

Паважаная рэдакцыя!

Прачытала ў нашай газеце (4—10 сакавіка) артыкул журналісткі Алены Малочка "Желтые тюльпаны для Натальи Петкевич" і вельмі здзівілася. Столькі павагі, захаплення ў аўтаркі да сваёй гераіні. І гэта пры тым, што Н.Пяткевіч адмовілася даць інтэрв'ю, адмежавалася ад пытанняў журналісткі.

Шмат гадоў мы назіралі за тым, як гэтая высокая чыноўніца ішла побач з прэзідэнтам і дапамагала яму замацоўваць існуючы рэжым у нашай краіне. Які ўклад яна зрабіла для людзей у нашай пакутнай Беларусі? І наогул, аб чым гэты артыкул?

У гэтым жа нумары журналіст Георгій Чыгір, вялікі майстар беларускага слова, пазнаёміў нас са сваёй гераіняй Святланай Лябедзька. Яна таксама — прыгажуня, але сціплая, адкрытая. Працуе Святлана настаўніцай у школе, з дзецьмі, а яшчэ яна нясе цяжкі крыж жонкі вядомага палітыка-змагара Анатоля Лябедзькі. І зараз ён ужо ў каторы раз сядзіць у засценках КДБ. Якія добрыя твары ў Святланы ды іх сына Арцёма! Колькі мужнасці ім патрэбна, каб вытрымаць цяжкія выпрабаванні!

Нас, чытачоў, вельмі трывожыць тое, што адбываецца ў жыцці яшчэ адной жанчыны, Наталлі Ільініч, што жыве ў в.Талька Пухавіцкага раёна. Гэта яна засталася беспрацоўнай сярод навучальнага года, настаўніца гісторыі. І без пенсіі, з дачкой-студэнткай. Вось бы атрымалася паўнавартаснае інтэрв'ю у журналісткі А.Малочка, калі б яна з'ездзіла ў Пухавіцкі раён ды зазірнула ў стомленыя вочы гэтай жанчыны. Ды яшчэ б "раскруціла" ўсіх дзеючых асоб гэтага супрацьзаконнага і сумнага спектакля!

А калі паважаная журналістка А.Малочка вядзе ў нашай газеце свецкую рубрыку, дык у нашай краіне дастаткова знакамітых і паважаных людзей. Гэта цудоўны паэт Ніл Сымонавіч Гілевіч, які сваімі вершамі перадае боль за нашу Радзіму. Гэта і шаноўныя паэты Рыгор Барадулін і Генадзь Бураўкін. А Зінаіда Бандарэнка, якая на працягу многіх гадоў несла святло і культуру на былым тэлебачанні! Яна і зараз актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці краіны. А як бы ўпрыгожыла нашу газету сустрэча са слаўнай актрысай Марыяй Захарэвіч. Шмат радасці яна прынесла гледачам Купалаўскага тэатра, а таксама ў радыёспектаклях...

Многа цікавага паведала б чытачам нашай газеты знакамітая Галіна Арлова, жонка і маці двух славутых акцёраў — Мікалаяў Яроменкаў.

Сярод маладых ёсць таксама таленавітыя і вядомыя носьбіты культуры. Толькі да іх трэба ісці. Гэта будзе і ім павага, і нам — радасць. На старонках нашай газеты такія сустрэчы таленавіта ладзяць журналісткі Марыя Эйсмант, Марына Коктыш, але, на жаль, вельмі рэдка.

Наша газета будзе яшчэ больш прывабнай і паўнавартаснай ад сустрэч з людзьмі, якія ўзбагачаюць нашу беларускую спадчыну.

З павагай —

**К.А.ЛЯВОНЕНКА,**
**былая настаўніца.**
*Мінск.*

### АД РЭДАКЦЫІ

**Шаноўная спадарыня Лявоненка!**

**Вашы слушныя заўвагі пастараемся ўлічыць у далейшай рабоце.**

ХАЧУ СПЫТАЦЬ...

*Мяне цікавіць, калі атрымаў першае генеральскае званне цяперашні міністр унутраных спраў Анатоль Куляшоў? Кажуць, што пагонамі генерал-лейтэнанта А.Лукашэнка разлічыўся з ім за крывавы разгон акцыі каля Дома ўрада 19 снежня. Увогуле, ці ёсць нейкія тэрміны, у адпаведнасці з якімі генералам могуць даваць чарговыя зорачкі на пагоны?*

***Ганна СІДАРЧУК.***

Мінскі раён.

## За што Анатоль Куляшоў атрымаў зорку на пагоны?



Не выключана, што сапраўды дадатковай зоркай А.Лукашэнка аддзячыў міністру ўнутраных спраў за падаўленне акцыі пратэсту ля Дома ўрада. Але варта адзначыць, што ніякіх парушэнняў закона ў прысваенні звання Куляшову няма. Не існуе таксама і вызначаных тэрмінаў, калі генералам могуць даваць чарговыя званні. Прыклад: сёння вам прысвоілі спецыяльнае званне генерал-маёра міліцыі, праходзіць паўгода, вы можаце атрымаць пагоны генерал-лейтэнанта (зразумела, калі кіраўнік дзяржавы, які падпісвае адпаведныя ўказы, палічыць, што вы таго вартыя).

**Анатоль Куляшоў** стаў генералам у чэрвені 2003 года, літаральна праз месяц пасля гэтага ён быў прызначаны кіраўніком ГУУС Мінгарвыканкама.

Варта адзначыць, што сілавікам грашовае ўтрыманне налічваецца па службовым акладзе і званні. Таму цяпер генерал-лейтэнант Куляшоў будзе атрымліваць больш грошай.

### ДЛЯ ПАРАЎНАННЯ

Папярэднік Куляшова **Уладзімір Навумаў** атрымаў званне генерал-маёра 25 верасня 2000 года, у гэты ж дзень ён быў прызначаны на пасаду міністра ўнутраных спраў, а ў маі 2005 года стаў генерал-лейтэнантам.

Старшыня КДБ **Вадзім Зайцаў** другую зорку на генеральскія пагоны атрымаў у ліпені 2009 года — прыкладна праз год пасля таго, як стаў кіраваць чэкістамі, а генералам стаў напрыканцы мая 2006 года, яшчэ падчас службы ў памежных войсках.

Цяперашні міністр абароны **Юрый Жадобін** генеральскія пагоны абмываў 23 лютага 2000 года, а генерал-лейтэнанта атрымаў разам з Зайцавым — у ліпені 2009 года (тады Жадобін працаваў дзяржсакратаром Савета бяспекі).

У верасні 2007 года генерал-маёрам стаў цяперашні старшыня Дзяржаўнага памежнага камітэта **Ігар Рачкоўскі**. У палкоўніках Ігар Анатольевіч хадзіў крыху больш за два гады — з 8 чэрвеня 2005 года.

У палкоўніках пакуль ходзіць кіраўнік Службы бяспекі прэзідэнта **Андрэй Уцюрын** — званне ён атрымаў у верасні 2007 года.

**Марына КОКТЫШ.**

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ...

## Какие сорта винограда вызревают в наших условиях?

С таким вопросом в редакцию обратился наш постоянный читатель Михаил Петрович Козловский. Полагаем, что и многие другие дачники хотят обзавестись виноградной лозой. А поэтому мы связались с учеными и подготовили такой ответ.

В условиях Беларуси вполне можно заниматься выращиванием винограда столовых сортов. У нас достаточно тепла и солнца для полноценного вызревания ягод таких сортов, как Августин, Восторг, Кантемировский, Гранд, Изюминка, Премьер, Сашенька и других.

З-ЗА КРАТ

## Віншую!

*Шчыра віншую ўсіх жанчын газеты "Народная Воля" са святам 8 Сакавіка!*

*Жадаю моцнага здароўя, шчасця і кахання! Моцы духу і трывучасці! Час сведчыць, што нашых беларускіх жанчын не зламаць. Я ганаруся нашымі жанчынамі!*

*Віншую праз вас усіх беларускіх жанчын, асобна Ірыну Халіп, Насту Палажанка, Наташу Радзіну! Трымайцеся!*

*З павагай —*

**Мікалай АЎТУХОВІЧ.**

З НАТУРЫ

## Не язда, а пакута

Убачыўшы на трамвайным прыпынку новы, чырвонага колеру і нязвыклай даўжыні вагон маршруту №1, узрадавалася: вось ён, прагрэс! Можа, з цягам часу скончацца, нарэшце, дарожныя пакуты, калі, толькі-толькі паспеўшы ўзяць білет, чуеш пагрозлівы крык з вадзіцельскай кабіны: "Пассажиры! Выходите, вагон дальше не идет!"

Ні прабачэння, ні тлумачэння, у чым справа. Але ж, выскачыўшы на вуліцу, даведваешся: ці аварыя на пуцях, ці паломка вагона.

Ну, думаю, новыя, мінскага вырабу, вагоны пачнуць выручаць. Толькі чаму даўно не бачу таго чырвонага прыгажуна?

На маё пытанне трамвайная кандуктарка сумна ўсміхаецца:

— Ды паламаўся наш новенькі, цяпер у рамонце, відаць, надоўга.

Прагрэс, па даўніх часах вядомы: будуем, ладзім — і адразу ў рамонт...

**Паліна ЛЯСКОВА,**
**жыхарка Мінска.**

НЕЗАБЫВАЕМОЕ

# Фронтовая дружба не знает границ

На всю жизнь запомнилась мне пора военного лихолетья.

В 1941 году была первая встреча с ранеными фронтовиками в госпиталях Сибири, где я курировал больных, будучи студентом Новосибирского медицинского института. Так как хирургов не хватало, то одновременно обучал первой медицинской помощи медицинских сестер Красного Креста, которые после окончания учебы направлялись на фронт.

